# ПРАФЕСІЙНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ АСОБЫ ЛІТАРАТУРНАГА РЭДАКТАРА МЕДЫЯТЭКСТАЎ І ПАТРАБАВАННІ ДА ЯЕ ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫХ АБАВЯЗКАЎ

**С. В. Зелянко**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zelianko@bsu.by*

У артыкуле разглядаюцца некаторыя прафесійныя асаблівасці працы літаратурнага рэдактара ў сучасных сродках масавай інфармацыі. Акрэслены шэраг кваліфікацыйныйных патрабаванняў да асобы рэдактара медыятэкстаў. Апісаны функцыянальныя абавязкі рэдактара СМІ. Вылучаны канцэптуальныя адрозненні ў працы выдавецкага літаратурнага рэдактара і медырэдактара.

***Ключавыя словы:*** рэдагаванне; літаратурнае рэдагаванне; рэдактар; абавязкі рэдактара; прафесія рэдактара; медыятэкст; медыя.

# PROFESSIONAL CHARACTERISTICS OF A LITERARY EDITOR OF MEDIA TEXTS AND REQUIREMENTS FOR HIS FUNCTIONAL DUTIES

**S. V. Zelianko**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: S. V. Zelianko (zelianko@bsu.by)*

The article examines some professional features of the work of a literary editor in mass media. Qualifying requirements for the editor of media texts are defined. The functional duties of a mass media editor are described. The differences in the work of a publishing literary editor and a mass media editor are highlighted.

***Key words:*** editing; literary editing; editor; responsibilities of the editor; editor’s profession; media text; media.

Як вядома, літаратурны рэдактар – гэта «спецыяліст, які займаецца аналізам, ацэнкай і ўдасканаленнем формы і зместу аўтарскага твора з пункту гледжання яго моўных якасцей, стылёвых уласцівасцей, кампазіцыйных характарыстык з мэтай падрыхтоўкі да апублікавання» [1,

с. 84]. Прафесійныя абавязкі літаратурнага рэдактара, які працуе ў сродках масавай інфармацыі з журналісцкімі тэкстамі, мала ў чым адрозніваюца ад службовых функцый, што выконвае рэдактар у выдавецкай арганізацыі пры ўдасканальванні аўтарскага твора.

Па-першае, гэта – рэдактарскі аналіз аўтарскага тэксту і вызначэнне яго грамадскай вартасці, з наступным адабрэннем твора да далейшай апрацоўкі і апублікавання або аргументаваным яго адхіленнем. Па-другое, пры неабходнасці літаратурная дапрацоўка твора, праверка і ўдасканальванне яго моўна-стылёвых, змястоўна-сэнсавых, лагічных, факталагічных, жанравых, кампазіцыйна-структурных уласцівасцей, выпраўленне памылак і недакладнасцей на ўсіх узроўнях тэкставага масіву. Напрыклад, выдавецтва «Народная асвета» ў абвестцы аб пошуках рэдактара пазначае наступныя абавязкі, якія павінен будзе выконваць адпаведны спецыяліст: «рэдагаванне вучэбнай, вучэбна-метадычнай і іншай літаратуры на рускай і беларускай мовах; падрыхтоўка арыгінал-макетаў да друку; праца з аўтарамі, метадыстамі» [2]. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы ў абвестцы аб вакансіі літаратурнага рэдактара прапісвае яго наступны прафесійныя абавязкі: «ажыццяўленне пошуку літаратурнага матэрыялу; ажыццяўленне правак (вычыткі) матэрыялаў; літаратурнае рэдагаванне і афармленне п’ес; улік і захоўванне дакументальнага матэрыялу тэатра» [3].

Аднак працоўная дзейнасць літаратурнага рэдактара ў сучасных сродках масавай інфармацыі апасродкуецца шэрагам экстралінгвістычных асаблівасцей, якія маюць на яе пэўны ўплыў. Так, літаратурная рэдактарская апрацоўка медыятэксту, як і яго стварэнне журналістам, характарызуецца, як правіла, аператыўнасцю, што патрабуе ад прафесійнага рэдактара не толькі пільнай увагі да магчымых маўленчых памылак і формавызначальных хібаў журналісцкага твора, але і ўмення працаваць у абмежаваныя тэрміны з вялікім аб’ёмам неаднароднай інфармацыі, пададзенай рознымі аўтарамі, у рознай стылістычнай манеры, у розных жанравых формах. Напрыклад, у актуальнай вакансіі «рэдактар інфармацыйнага сайта», якую на адным з рэкрутынгавых інтэрнэт-сервісаў размясціла УП «Агенцтва Мінск-Навіны», пералічваюцца наступны прафесійныя абавязкі кандыдата на працоўнае месца: «праверка, рэдагаванне і карэктура тэкстаў (навін); напісанне крэатыўных загалоўкаў; аналіз і стварэнне навінавай карціны дня; маніторынг стужак навін, паведамленняў, сайтаў дзяржаўных органаў, кампаній і грамадскіх арганізацый; інфармацыйнае запаўненне сайта на Wordpress» [4]. Сярод прафесійных патрабаванняў да асобы прэтэндэнта на гэтую вакансію адзначаюцца: «вышэйшая профільная адукацыя; вопыт працы ад 3-х гадоў; граматнасць; упэўнены карыстальнік ПК (Word, база-

выя веды Photoshop, пажадана знаёмства з Wordpress); веданне грамадска-палітычнага жыцця краіны і Мінска; уменне працаваць з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі, хуткасць і дакладнасць; шырокі кругагляд» [4]. Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»» да асобы стылістычнага рэдактара, якога запрашаюць на працу ў холдынг, вылучае наступныя кваліфікацыйныя патрабаванні: «дасканалае веданне беларускай мовы; веданне стылістыкі мовы; досвед працы ў СМІ» [5]. У якасці прафесійнага абавязку ўказваецца толькі «стылістычнае рэдагаванне перыядычнага друкаванага выдання» [5].

Пры гэтым, літаратурныя рэдактары ў СМІ даволі часта сутыкаюцца з ненармаваным працоўным графікам, які тлумачыцца неабходнасцю неадкладнай публікацыі пэўнай навіны ў стужцы інфармацыйнага агенцтва, тэрміновай здачай нумара ў набор, экстраным выхадам у эфір тэлевізійнай ці радыёпраграмы. Літаратурны рэдактар, які працуе ў сучасных медыйных арганізацыях, ва ўмовах іх інтэграцыі, пераўладкавання, засваення новых інтэрнэт-каналаў распаўсюджвання інфармацыі, павінен ведаць асаблівасці падрыхтоўкі журналісцкіх тэкстаў розных жанравых форм да публікацыі ў друкаваных, аўдыявізуальных і вэб-СМІ. Нарэшце, прафесійная праца літаратурнага рэдактара ў сродках масавай інфармацыі апасродкуецца камунікатыўнымі асаблівасцямі, што вынікаюць з неабходнасці пастаяннага і шчыльнага міжасобаснага ўзаемадзеяння з вялікай колькасцю калег (медыяменеджараў, аўтараў-журналістаў, сцэнарыстаў, карэктараў, вярстальшчыкаў, дызайнераў, фатографаў, мастакоў і інш.), якія таксама прымаюць непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы да апублікавання медыяпрадукта.

Сукупнасць пералічаных вышэй экстралінгвістычных фактараў адлюстроўвае спецыфіку працы медыярэдактара ў сучасным інфармацыйным грамадстве і яскрава дэманструе наяўнасць пэўных адрозных рыс у функцыянальных абавязках выдавецкага літаратурнага рэдактара.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Зелянко С. В.* Методыка рэдагавання: вучэб.-метад. комплекс. Мінск: БДУ, 2017. 88 с.
2. Редактор / Хэдхантер [Электронный ресурс]. URL: https://hh.ru/vacancy/84717739 (дата обращения: 15.09.2023).
3. Литературный редактор / Хэдхантер [Электронный ресурс]. URL: https://hh.ru/vacancy/86522470 (дата обращения: 15.09.2023).
4. Редактор информационного сайта / Хэдхантер [Электронный ресурс]. URL: https://hh.ru/vacancy/86039032 (дата обращения: 15.09.2023).
5. Редактор стилистический / Хэдхантер [Электронный ресурс]. URL: https://hh.ru/vacancy/86553590 (дата обращения: 15.09.2023).